ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______ 20__ № ____

# АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
(АСВА 1-23 01 12-2021)

## ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ. I СТУПЕНЬ

**Спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)**
**Напрамак спецыяльнасці 1-23 01 12-01 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (гісторыя і музеялогія)**
**Кваліфікацыя Гісторык-музеёлаг. Выкладчык**

## ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ. I СТУПЕНЬ

**Специальность 1-23 01 12 Музейное дело и охрана историко-культурного наследия (по направлениям)**
**Направление специальности 1-23 01 12-01 Музейное дело и охрана историко-культурного наследия (история и музеология)**
**Квалификация Историк-музеолог. Преподаватель**

## HIGHER EDUCATION. I STAGE

**Speciality 1-23 01 12 Museum Studies and Protection of Historical and Cultural Heritage (majors in)**
**Major in 1-23 01 12-01 Museum Studies and Protection of Historical and Cultural**
**Heritage (majors in) (History and Museology)**
**Qualification Historian. Museologist. Teacher**

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Адукацыйны стандарт вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) (далей – адукацыйны стандарт) прымяняецца пры распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі І ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, і адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі першай ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, (далей, калі не вызначана іншае, – адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі І ступені), вучэбна-метадычнай дакументацыі, вучэбных выданняў, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў.

Дадзены адукацыйны стандарт абавязковы для прымянення ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках).

2. У дадзеным адукацыйным стандарце выкарыстаны спасылкі на наступныя акты заканадаўства:

Кодекс Республики Беларусь об образовании;

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры;

СТБ ISO 9000-2015 Системы менеджмента качества. Основные положения и словарь (далей – СТБ ISO 9000-2015);

Общегосударственный классификатор Республики Беларусь ОКРБ 011-2009 «Специальности и квалификации» (далей – ОКРБ 011-2009);

Общегосударственный классификатор Республики Беларусь ОКРБ 005-2011 «Виды экономической деятельности» (далей – ОКРБ 005-2011).

3. У дадзеным адукацыйным стандарце выкарыстоўваюцца тэрміны, вызначаныя ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама наступныя тэрміны з адпаведнымі азначэннямі:

ахова гісторыка-культурнай спадчыны – напрамак культурнай дзейнасці, які ўключае сістэму арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных, і (або) іншых мер, накіраваных на вылучэнне культурных каштоўнасцей для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, наданне культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, улік, захаванне, аднаўленне, утрыманне і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей, што ажыццяўляецца ў мэтах

зберажэння і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны і стварэння ўмоў для яе перадачы наступным пакаленням (Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры);

базавыя прафесійныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з вышэйшай адукацыяй I ступені і якія адлюстроўваюць яго здольнасць вырашаць агульныя задачы прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю;

вынікі навучання – веды, уменні і навыкі (досвед), якія асоба, якая навучаецца, можа прадэманстраваць па завяршэнні вывучэння канкрэтнай вучэбнай дысцыпліны або модуля;

гісторыка-культурная спадчына – сукупнасць найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленных у гісторыка-культурных каштоўнасцях (Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры);

забеспячэнне якасці – частка менеджменту якасці, накіраваная на забеспячэнне ўпэўненасці, што патрабаванні да якасці будуць выкананы (СТБ ISO 9000-2015);

заліковая адзінка – лічбавы спосаб выяўлення працаёмістасці вучэбнай работы студэнта, курсанта, слухача, заснаваны на дасягненні вынікаў навучання;

кампетэнтнасць – здольнасць прымяняць веды і навыкі для дасягнення намечаных вынікаў (СТБ ISO 9000-2015);

кампетэнцыя – веды, уменні і вопыт, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

кваліфікацыя – падрыхтаванасць работніка да прафесійнай дзейнасці для выканання работ пэўнай складанасці ў межах спецыяльнасці, напрамку спецыяльнасці (ОКРБ 011-2009);

модуль – адносна адасобленая, лагічна завершаная частка адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае фарміраванне пэўнай кампетэнцыі (групы кампетэнцый);

музей – арганізацыя культуры або падраздзяленне юрыдычнай асобы, якія выяўляюць прадметы музейнага значэння, камплектуюць музейныя фонды, ажыццяўляюць на пастаяннай аснове ўлік і захоўванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыю музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў (Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры);

музейная справа – напрамак культурнай дзейнасці па стварэнні і развіцці музеяў, выяўленні прадметаў музейнага значэння, камплектаванні музейных фондаў, а таксама па ўліку, захоўванні, вывучэнні, выкарыстанні і папулярызацыі музейных прадметаў, навукова-

дапаможных і сыравінных матэрыялаў, ажыццяўленні іншых відаў музейнай дзейнасці (Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры);

музейны фонд – навукова абгрунтаваная сукупнасць музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, якія пастаянна захоўваюцца ў музеі (Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры);

спецыялізаваныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з вышэйшай адукацыяй І ступені і якія адлюстроўваюць яго здольнасць вырашаць спецыялізаваныя задачы прафесійнай дзейнасці з улікам скіраванасці адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі І ступені ва ўстанове вышэйшай адукацыі;

спецыяльнасць – від прафесійнай дзейнасці, які патрабуе пэўных ведаў, уменняў і кампетэнцый, што набываюцца шляхам навучання і практычнага досведу – падсістэма групы спецыяльнасцей (ОКРБ 011-2009);

універсальныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да спецыяліста з вышэйшай адукацыяй І ступені і якія адлюстроўваюць яго здольнасць прымяняць базавыя агульнакультурная веды і ўменні, а таксама сацыяльна-асобасныя якасці, якія адпавядаюць запытам дзяржавы і грамадства.

4. Спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) у адпаведнасці з ОКРБ 011-2009 адносіцца да профілю адукацыі Е «Камунікацыі. Права. Эканоміка. Кіраванне. Эканоміка і арганізацыя вытворчасці», напрамку адукацыі 23 «Камунікацыі».

У адпаведнасці з ОКРБ 011-2009 па спецыяльнасці прадугледжаны напрамкі спецыяльнасці:

1-23 01 12-01 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (гісторыя і музеялогія), які забяспечвае атрыманне кваліфікацыі «Гісторык-музеёлаг. Выкладычык»;

1-23 01 12-02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (мастацтвазнаўства і музеялогія), які забяспечвае атрыманне кваліфікацыі які забяспечвае атрыманне кваліфікацыі «Гісторык-музеёлаг. Выкладычык»;

1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм), які забяспечвае атрыманне кваліфікацыі які забяспечвае атрыманне кваліфікацыі «Мэнэджар па культурнай спадчыне і турызму».

5. Спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) адносіцца да ўзроўню 6 Нацыянальнай рамкі кваліфікацый вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 2
## ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ АДУКАЦЫІ АСОБ, ЯКІЯ ПАСТУПАЮЦЬ ДЛЯ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ І СТУПЕНІ, І ТЭРМІНАЎ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ І СТУПЕНІ

6. На ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі могуць паступаць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю або прафесійна-тэхнічную адукацыю з агульнай сярэдняй адукацыяй або сярэднюю спецыяльную адукацыю, пацверджаную адпаведным дакументам аб адукацыі.

Прыём асоб для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені ажыццяўляецца на падставе пункта 9 артыкула 57 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і ў адпаведнасці з Правіламі, якія зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

7. Навучанне па спецыяльнасці прадугледжвае наступныя формы атрымання вышэйшай адукацыі І ступені:

вочная (дзённая, вячэрняя);

завочная (у тым ліку дыстанцыйная).

8. Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі І ступені ў дзённай форме складае 4 гады.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі І ступені ў вячэрняй форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі І ступені ў завочнай форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі І ступені ў дыстанцыйнай форме складае 5 гадоў.

9. Пералік спецыяльнасцей сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адукацыйныя праграмы па якіх могуць быць інтэграваныя з адукацыйнай праграмай вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) асобамі, якія навучаюцца па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі І ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, можа быць скарочаны ўстановай вышэйшай адукацыі пры ўмове выканання патрабаванняў дадзенага адукацыйнага стандарту ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Тэрмін атрымання навучання па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі І ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у вячэрняй і завочнай (у тым ліку дыстанцыйнай) формах можа павялічвацца на 0,5 – 1 год адносна тэрміна навучання па дадзенай адукацыйнай праграме ў дзённай форме.

10. Пры навучанні па індывідуальным вучэбным плане незалежна ад формы атрымання адукацыі тэрмін навучання вызначаецца самастойна ўстановай вышэйшай адукацыі, але не больш тэрміну атрымання вышэйшай адукацыі І ступені, вызначанага для адпаведнай формы атрымання адукацыі.

Пры навучанні па індывідуальным вучэбным плане асоб з абмежаванымі магчымасцямі ўстанова вышэйшай адукацыі мае права прадоўжыць тэрмін не больш чым на 1 год у параўнанні з тэрмінам, вызначаным для адпаведнай формы атрымання адукацыі.

11. Агульны аб’ём адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі І ступені складае 240 заліковых адзінак.

Сума заліковых адзінак за 1 год навучання пры атрыманні вышэйшай адукацыі ў дзённай форме складае 60 заліковых адзінак, пры навучанні па індывідуальным вучэбным плане – не больш за 75 заліковых адзінак. Пры атрыманні вышэйшай адукацыі ў вячэрняй, завочнай і дыстанцыйнай формах сума заліковых адзінак за 1 год навучання, як правіла, не перавышае 60 заліковых адзінак..

## ГЛАВА 3
## ПАТРАБАВАННІ ДА ЗМЕСТУ ПРАФЕСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СПЕЦЫЯЛІСТА З ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫЯЙ

12. Асноўнымі відамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста ў адпаведнасці з ОКРБ 005-2011 з’яўляюцца:

9102 Дзейнасць музеяў;

9103 Дзейнасць гістарычных месц і пабудоў і аналагічных турыстычных славутасцей;

791 Турыстычная дзейнасць;

854 Вышэйшая і паслясярэдняя адукацыя;

722 Навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне грамадскіх і гуманітарных навук;

856 Дапаможныя адукацыйныя паслугі;

910 Дзейнасць бібліятэк і архіваў.

Спецыяліст можа ажыццяўляць іншыя віды прафесійнай дзейнасці пры ўмове адпаведнасці ўзроўню яго адукацыі і набытых кампетэнцый патрабаванням да кваліфікацыі работніка.

13. Аб’ектамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста з’яўляюцца культурная і прыродная спадчына, іх захаванне і актуалізацыя; узнікненне, развіццё і функцыянаванне музеяў і ўстаноў музейнага тыпу; формы і сродкі музейнай камунікацыі; адукацыйныя працэсы ў сістэмах вышэйшай, сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь; арганізацыйна-метадычная, кіраўнічая дзейнасць у сферы турызма.

14. Спецыяліст можа вырашаць задачы наступных тыпаў:

– аналіз, сістэматызацыя і ацэнка калекцый Дзяржаўнага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, а таксама нерухомых помнікаў;

– праектаванне, эксплуатацыя і ўдасканаленне (у частцы інфармацыйнага забеспячэння) стацыянарных музейных экспазіцый, выстаў і турыстычных маршрутаў;

– падрыхтоўка экскурсій і ўкараненне іншых сучасных формаў папулярызацыі нацыянальнага гісторыка-культурнай спадчыны;

– удзельнічаць у распрацоўцы найноўшых інфармацыйных тэхналогій, якія закранаюць сферу ўліку і папулярызацыі музейных калекцый;

– выкладанне гістарычных, спецыяльных гістарычных, мастацтвазнаўчых дысцыплін;

– планаванне і арганізацыя мэнэджарскай, маркетынгавай працы ў галіне турызму;

– распрацоўка і ўкараненне новых метадаў даследаванняў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

14. Спецыяліст можа вырашаць задачы наступных тыпаў: музейна-вытворчыя, арганізацыйна-праектныя, навукова-даследчыя, педагагічныя, кансультацыйныя.

Музейна-вытворчыя:

- аналіз, сістэматызацыя і ацэнка калекцый Дзяржаўнага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, а таксама нерухомых помнікаў;

- планаваць і выконваць работу па бягучаму і перспектыўнаму камплектаванню музейных калекцый, іх уліку ў адпаведнасці з прававымі нормамі і прынцыпамі;

- планаванне і арганізацыя мэнэджарскай, маркетынгавай працы ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

Арганізацыйна-праектныя:

- праектаванне, эксплуатацыя і ўдасканаленне (у частцы інфармацыйнага забеспячэння) стацыянарных музейных экспазіцый, выстаў і турыстычных маршрутаў;

- удзельнічаць у распрацоўцы найноўшых інфармацыйных тэхналогій, якія закранаюць сферу ўліку і папулярызацыі музейных калекцый;

Навукова-даследчыя:

- распрацоўка і ўкараненне новых метадаў даследаванняў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

- валодаць сучаснымі методыкамі вывучэння, актуалізацыі і інтэрпрэтацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны

Педагагічныя:

- выкладанне гістарычных, спецыяльных гістарычных, мастацтвазнаўчых дысцыплін;- падрыхтоўка экскурсій і ўкараненне іншых сучасных формаў папулярызацыі нацыянальнага гісторыка-культурнай спадчыны;

- выкарыстанне сучасных форм работы з музейнай аўдыторыя, удасканаленне навыкаў прафесійнай камунікацыі;

Кансультацыйныя:

- першасная атрыбуцыя і экспертыза помнікаў матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

- кансультацыйная падтрымка па пытаннях арганізацыі і функцыянавання музейных устаноў дзяражаўнага і недзяржаўнага тыпаў.

## ГЛАВА 4
## ПАТРАБАВАННІ ДА КАМПЕТЭНТНАСЦІ СПЕЦЫЯЛІСТА

15. Спецыяліст, які засвоіў змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), павінен валодаць універсальнымі, базавымі прафесійнымі і спецыялізаванымі кампетэнцыямі.

Універсальныя, базавыя прафесійныя і спецыялізаваныя кампетэнцыі вызначаюцца з улікам Нацыянальнай рамкі кваліфікацый вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

16. Спецыяліст, які засвоіў змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, павінен валодаць наступнымі універсальнымі кампетэнцыямі (далей - УК):

УК-1 Валодаць асновамі даследчыцкай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі;

УК-2 Вырашаць стандартныя задачы прафесійнай дзейнасці на аснове прымянення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

УК-3 Ажыццяўляць камунікацыі на замежнай мове для вырашэння задач міжасобаснага і міжкультурнага ўзаемадзеяння;

УК-4 Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя,

этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

УК-5 Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці;

УК-6 Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да змен у прафесійнай дзейнасці;

УК-7 Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму;

УК-8 Валодаць сучаснай культурай мыслення, выкарыстоўваць асновы філасофскіх ведаў у прафесійнай дзейнасці;

УК-9 Аналізаваць і ацэньваць сацыяльна значныя з'явы, падзеі, працэсы, праяўляць прадпрымальніцкую ініцыятыву і рэалізоўваць навуковыя, сацыяльныя інавацыі;

УК-10 Планаваць, арганізоўваць і весці мэнэджарскую, маркетынгавую і фінансавую дзейнасць у музейных установах і арганізацыях;

УК-11 Валодаць дзяржаўнымі мовамі для ажыццяўлення прафесійнай камунікацыі, падрыхтоўкі навуковых тэкстаў;

УК-12 Прымяняць сучасныя педагагічныя метады і тэхналогіі для арганізацыі рознаўзроўневага навучання з улікам ступені асобаснага развіцця навучэнцаў;

УК-13 Валодаць навыкамі здароўезберажэння.

17. Спецыяліст, які засвоіў змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, павінен валодаць наступнымі базавымі прафесійнымі кампетэнцыямі (далей – БПК):

БПК-1 Валодаць класічнай мовай на ўзроўні дастатковым для разумення і інтэрпрэтацыі гістарычных крыніц;

БПК-2 Прымяняць тэарэтычныя і метадалагічныя асновы гістарычна-культурных і музеялагічныя ведаў у дзейнасці сучаснага музея і даследаваннях аб'ектаў культурнай і прыроднай спадчыны;

БПК-3 Аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістарычныя падзеі і працэсы, дасягненні сусветнай і айчыннай культуры, агульныя заканамернасці фарміравання культурнай спадчыны;

БПК-4 Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцяў, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыяльна-культурную сітуацыю;

БПК-5 Характарызаваць асноўныя тэндэнцыі рэгіянальнага культурнага развіцця, вылучаць, фармуляваць і ацэньваць ключавыя напрамкі і асаблівасці развіцця розных этнакультурных рэгіёнаў;

БПК-6 Вылучаць асноўныя этапы і крыніцы фарміравання культурнай спадчыны Беларусі, комплекс яе характарыстык;

БПК-7 Валодаць сучаснымі методыкамі вывучэння, актуалізацыі і інтэрпрэтацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

БПК-8 Прымяняць асноўныя метады, спосабы і сродкі атрымання, захавання, пераапрацоўкі інфармацыі, навыкі выкарыстання спецыяльнага праграмнага забеспячэння для ўліку і інтэрпрэтацыі культурнай спадчыны;

БПК-9 Прымяняць асноўныя метады абароны вытворчага персаналу і насельніцтва ад негатыўных уздзеянняў фактараў антрапагеннага, тэхнагеннага, натуральнага паходжання, прынцыпы рацыянальнага прыродакарыстання і энергазберажэння, забяспечваць здаровыя і бяспечныя ўмовы працы;

18. Пры распрацоўцы адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені на аснове дадзенага адукацыйнага стандарту ўсе УК і БПК уключаюцца ў набор неабходных вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені ў адпаведнасці з дадзеным адукацыйным стандартам.

Пералік вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам УК можа быць дапоўнены ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам скіраванасці адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

Пералік спецыялізаваных кампетэнцый установа вышэйшай адукацыі вызначае самастойна з улікам скіраванасці адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

Дадатковыя УК і спецыялізаваныя кампетэнцыі вызначаюцца на падставе патрабаванняў рынку працы, абагульнення замежнага вопыту, правядзення кансультацый з вядучымі працадаўцамі, аб'яднаннямі працадаўцаў адпаведнай галіны, іншых крыніц.

Сукупнасць вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам УК і БПК, а таксама вызначаных установай вышэйшай адукацыі дадатковых УК і спецыялізаваных кампетэнцый, павінна забяспечваць спецыялісту здольнасць ажыццяўляць не менш чым адзін від прафесійнай дзейнасці, вырашаючы пры гэтым не менш аднаго тыпу задач прафесійнай дзейнасці, названых у пунктах 12 і 14 дадзенага адукацыйнага стандарту.

## ГЛАВА 5
## ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧЭБНА-ПРАГРАМНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

19. Адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі I ступені ўключае наступную вучэбна-праграмную дакументацыю:

тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці);

вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі);

тыпавыя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах;

вучэбныя праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах;

праграмы практык.

20. Максімальны аб'ём вучэбнай нагрузкі асобы, якая навучаецца, не павінен перавышаць 54 акадэмічныя гадзіны ў тыдзень, уключаючы ўсе віды аўдыторнай і пазааўдыторнай работы.

Аб'ём абавязковых аўдыторных заняткаў студэнтаў, які вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам спецыяльнасці, спецыфікі арганізацыі вучэбнага працэсу, аснашчанасці вучэбна-лабараторнай базы, інфармацыйнага, вучэбна-метадычнага забеспячэння, вызначаецца ў межах 24–32 аўдыторных гадзін у тыдзень.

У гадзіны, якія адводзяцца на самастойную работу па вучэбнай дысцыпліне (модулі), уключаецца час, прадугледжаны на падрыхтоўку да экзамену (экзаменаў) і (або) заліку (залікаў) па дадзенай вучэбнай дысцыпліне (модулі).

21. Навучальны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) распрацоўваецца ў адпаведнасці са структурай, прыведзенай у табліцы 1.

Табліца 1

| №<br>п/п | Найменне відаў дзейнасці асобы, якая навучаецца, модуляў, вучэбных дысцыплін | Працаёмістасць<br>(у заліковых адзінках) |
|---|---|---|
| **1.** | **Тэарэтычнае навучанне** | **192-212** |
| 1.1. | Дзяржаўны кампанент: сацыяльна-гуманітарны модуль 1 (Эканоміка, Філасофія, Паліталогія); лінгвістычны модуль (Замежная мова (агульнае валоданне), Лацінская мова); модуль «Айчынная гісторыя» (Гісторыя Беларусі); модуль «Гісторыя сусветных цывілізацый» (Усеагульная гісторыя, Гісторыя славянскіх народаў); Модуль «Народазнаўства» (Этналогія, Этналогія Беларусі); Модуль «Музеялогія» (Гісторыя музейнай справы, Тэорыя і методыка музейнай справы);модуль «Курсавая работа» (Курсавая работа 1, Курсавая работа 2, Курсавая работа 3). | 86-138 |
| 1.2. | Кампанент установы вышэйшай адукацыі | 98-120 |
| 1.3. | Факультатыўныя дысцыпліны | |
| 1.4. | Дадатковыя віды навучання | |
| **2.** | **Вучэбная практыка** | **3-9** |
| **3.** | **Вытворчая практыка** | **18-26** |
| **4.** | **Дыпломнае праектаванне** | **8-16** |
| | **Усяго** | **240** |

22. Размеркаванне працаёмістасці паміж асобнымі модулямі і вучэбнымі дысцыплінамі дзяржаўнага кампанента, а таксама асобнымі відамі вучэбных і вытворчых практык ажыццяўляецца ўстановай вышэйшай адукацыі.

23. Назвы вучэбных і вытворчых практык вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам асаблівасцей прафесійнай дзейнасці спецыяліста.

24. Працаёмістасць кожнай вучэбнай дысцыпліны павінна складаць не менш за тры залiковых адзінкі. Адпаведна, працаёмістасць кожнага модуля павінна складаць не менш за шэсць заліковых адзінак.

25. Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці рэкамендуецца прадугледжваць у рамках кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі модулі і вучэбныя дысцыпліны па выбары асобы, якая навучаецца, у аб'ёме не менш як 15 працэнтаў ад агульнага аб'ёму тэарэтычнага навучання.

26. Коды УК і БПК, фарміраванне якіх забяспечваюць модулі і вучэбныя дысцыпліны дзяржаўнага кампанента, пазначаны ў табліцы 2.

Табліца 2

| № п/п | Найменне модуляў, вучэбных дысцыплін | Коды кампетэнцый, якія фарміруюцца |
|---|---|---|
| 1.1 | Сацыяльна-гуманітарны модуль 1 | |
| 1.1.1 | Эканоміка | УК-9, 10 |
| 1.1.2 | Філасофія | УК-8 |
| 1.1.3 | Паліталогія | УК-7 |
| 1.2 | Лінгвістычны модуль | |
| 1.2.1 | Замежная мова (агульнае валоданне) | УК-3 |
| 1.2.2 | Лацінская мова | БПК-1 |
| 1.3 | Модуль «Айчынная гісторыя» | УК-5,7, БПК-3 |
| 1.3.1 | Гісторыя Беларусі | |
| 1.4 | Модуль «Гісторыя сусветных цывілізацый» | УК-4,7, БПК-4 |
| 1.4.1 | Усеагульная гісторыя | |
| 1.4.2 | Гісторыя славянскіх народаў | |
| 1.5 | Модуль «Народазнаўства» | УК-4,7, БПК-4,5 |
| 1.5.1 | Этналогія | |
| 1.5.2 | Этналогія Беларусі | |
| 1.6 | Модуль «Музеялогія» | УК-10 |
| 1.6.1 | Гісторыя музейнай справы | |
| 1.6.2 | Тэорыя і методыка музейнай справы | |
| 1.7 | Модуль «Курсавая работы» | УК-1,2,5,6, 11, БПК-2 |
| 1.7.1 | Курсавая работа 1 | |
| 1.7.2 | Курсавая работа 2 | |
| 1.7.3 | Курсавая работа 3 | |

27. Вынікі навучання па модулях і вучэбных дысцыплінах дзяржаўнага кампанента (ведаць, умець, валодаць) вызначаюцца вучэбнымі праграмамі.

28. Вынікі навучання па модулях і вучэбных дысцыплінах кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі, практыках, дыпломным праектаванні ўстанова вышэйшай адукацыі плануе самастойна. Установа вышэйшай адукацыі таксама можа канкрэтызаваць і дапаўняць вынікі навучання па модулях і вучэбных дысцыплінах дзяржаўнага кампанента, вызначаныя тыпавымі вучэбнымі праграмамі па вучэбных дысцыплінах.

29. Вынікі навучання павінны быць суаднесены з неабходнымі вынікамі засваення зместу адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені (кампетэнцыямі).

30. Сукупнасць запланаваных вынікаў навучання павінна забяспечваць выпускніку фарміраванне ўсіх УК і БПК, вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам, а таксама ўсіх дадатковых універсальных кампетэнцый і спецыялізаваных кампетэнцый, вызначаных установай вышэйшай адукацыі самастойна.

## ГЛАВА 6
## ПАТРАБАВАННІ ДА АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

31. Педагагічныя работнікі ўстановы вышэйшай адукацыі павінны:

займацца навукова-метадычнай дзейнасцю;

валодаць сучаснымі адукацыйнымі, у тым ліку інфармацыйнымі тэхналогіямі, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу на належным узроўні;

валодаць асобаснымі якасцямі і кампетэнцыі, якія дазваляюць эфектыўна арганізоўваць вучэбную і выхаваўчую работу са студэнтамі, курсантамі, слухачамі.

Для чытання лекцый па рашэнні савета ўстановы вышэйшай адукацыі (савета факультэта) могуць прыцягвацца старшыя выкладчыкі, якія маюць досвед навукова-педагагічнай работы не менш 5 гадоў.

Доля штатных навукова-педагагічных работнікаў павінна складаць не менш за 50 працэнтаў ад агульнай колькасці педагагічных работнікаў установы вышэйшай адукацыі.

Для ажыццяўлення адукацыйнага працэсу (чытанне лекцый, кіраўніцтва дыпломнымі праектамі (дыпломнымі работамі) і інш.) могуць прыцягвацца вядучыя спецыялісты рэальнага сектара эканомікі без вучонай ступені і вучонага звання, дзейнасць якіх звязана са спецыяльнасцю вышэйшай адукацыі I ступені.

32. Установа вышэйшай адукацыі павінна мець:

матэрыяльна-тэхнічную базу, неабходную для арганізацыі адукацыйнага працэсу, самастойнай работы і развіцця асобы студэнта, курсанта, слухача;

сродкі навучання, неабходныя для рэалізацыі адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені (прыборы, абсталяванне, інструменты, вучэбна-наглядныя дапаможнікі, камп’ютары, камп’ютарныя сеткі, аўдыёвізуальныя сродкі і іншыя матэрыяльныя аб’екты).

Функцыянаванне інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя ўстановы вышэйшай адукацыі забяспечваецца адпаведнымі сродкамі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і павінна адпавядаць заканадаўству.

Асобы, якія навучаюцца, з ліку асоб з абмежаванымі магчымасцямі павінны быць забяспечаны адаптаванымі друкаванымі і (або) электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі.

У выпадку прымянення дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій дапускаецца замена спецыяльна абсталяваных памяшканняў іх віртуальнымі аналагамі, якія дазваляюць навучэнцам набыць кампетэнцыі, вызначаныя ў раздзеле 6 дадзенага адукацыйнага стандарту.

Патрабаванні да рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I ступені ў сеткавай форме павінны забяспечвацца сукупнасцю рэсурсаў матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, што прадстаўляюцца ўстановамі вышэйшай адукацыі (арганізацыямі), якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі праграмы вышэйшай адукацыі I ступені ў сеткавай форме.

33. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу павінна адпавядаць наступным патрабаванням:

вучэбныя дысцыпліны (модулі) павінны быць забяспечаны сучаснай вучэбнай, даведачнай, іншай літаратурай, вучэбнымі праграмамі, вучэбна-метадычнай дакументацыяй, вучэбна-метадычнымі, інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі, у тым ліку ў электронным выглядзе;

павінен быць забяспечаны доступ для кожнага студэнта, курсанта, слухача да бібліятэчных фондаў, электронных сродкаў навучання, электронных інфармацыйных рэсурсаў (лакальнага доступу, аддаленага доступу) па ўсіх вучэбных дысцыплінах (модулях).

Навукова-метадычнае забеспячэнне павінна быць арыентавана на распрацоўку і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій, адэкватных кампетэнтнаснаму падыходу (крэатыўнага і дыялогавага навучання, варыятыўных мадэляў самастойнай работы, модульных і рэйтынгавых сістэм навучання, тэставых і іншых сістэм ацэньвання ўзроўню кампетэнцый і г.д. ).

Абавязковым элементам навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу з’яўляецца размешчаны на сайце ўстановы вышэйшай адукацыі каталог вучэбных дысцыплін (модуляў), які

адпавядае наступным патрабаванням:

уключае ў сябе зручную ў выкарыстанні і актуальную інфармацыю, даступную для абітурыентаў на этапе ўступнай кампаніі, а таксама для студэнтаў, курсантаў, слухачоў на працягу ўсяго перыяду навучання;

прадстаўляецца на беларускай і (або) рускай, а таксама англійскай мовах;

апісанне кожнай вучэбнай дысцыпліны (модуля) змяшчае кароткі змест, кампетэнцыі, якія фарміруюцца, вынікі навучання (ведаць, умець, валодаць), семестр, перадрэквізіты, працаёмістасць у заліковых адзінках (крэдытах), колькасць аўдыторных гадзін і самастойнай работы, патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі ;

аб’ём апісання вучэбнай дысцыпліны (модуля) складае максімум адну старонку;

каталог вучэбных дысцыплін (модуляў) суправаджаецца структурнай схемай адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені з заліковым адзінкамі.

Установы вышэйшай адукацыі маюць права самастойна прымаць рашэнне аб фармаце каталога вучэбных дысцыплін (модуляў) і паслядоўнасці прадстаўлення інфармацыі.

Патрабаванні да рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I ступені ў сеткавай форме павінны забяспечвацца сукупнасцю рэсурсаў навукова-метадычнага забеспячэння, што прадстаўляюцца ўстановамі вышэйшай адукацыі (арганізацыямі), якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі праграмы вышэйшай адукацыі I ступені ў сеткавай форме.

34. Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы вызначаюцца заканадаўствам.

35. Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы вызначаюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах вышэйшай адукацыі і праграмна-плануючай дакументацыяй выхавання.

36. Канкрэтныя формы і працэдуры прамежкавага кантролю ведаў асоб, якія навучаюцца, па кожнай дысцыпліне распрацоўваюцца адпаведнай кафедрай установы вышэйшай адукацыі і адлюстроўваюцца ў вучэбных праграмах установы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах.

37. Для атэстацыі асоб, якія навучаюцца, на адпаведнасць іх персанальных дасягненняў паэтапным ці канчатковым патрабаванням адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені ствараюцца фонды ацэначных сродкаў, якія ўключаюць тыпавыя заданні, заданні адкрытага тыпу, заданні камунікатыўнага тыпу, кантрольныя работы, тэсты, комплексныя кваліфікацыйныя заданні, тэматыку курсавых праектаў

(курсавых работ), метадычныя распрацоўкі па інавацыйных формах навучання і кантролю за фарміраваннем кампетэнцый, тэматыку і прынцыпы складання эсэ, формы анкет для правядзення самаацэнкі кампетэнцый асоб, якія навучаюцца,  і г.д. Фонды ацэначных сродкаў распрацоўваюцца адпаведнымі кафедрамі ўстановы вышэйшай адукацыі.

38. Ацэначнымі сродкамі павінна прадугледжвацца ацэнка здольнасці асоб, якія навучаюцца, да творчай дзейнасці, іх гатоўнасць весці пошук вырашэння новых задач, звязаных з недастатковасцю канкрэтных спецыяльных ведаў і адсутнасцю агульнапрынятых алгарытмаў.

## ГЛАВА 7
## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКОВАЙ АТЭСТАЦЫІ

39. Выніковая атэстацыя ажыццяўляецца дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй.

Да выніковай атэстацыі дапускаюцца студэнты, курсанты, слухачы, якія цалкам выканалі адпаведныя вучэбны план і вучэбныя праграмы.

Выніковая атэстацыя студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) праводзіцца ў форме дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці, напрамку спецыяльнасці і абароны дыпломнай работы.

Пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі фарміруюцца або развіваюцца кампетэнцыі, прыведзеныя ў табліцы 2 дадзенага адукацыйнага стандарту.

40. Праграма дзяржаўнага экзамену распрацоўваецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

41. Патрабаванні да структуры, зместу, аб'ёму і парадку абароны дыпломнага праекта (дыпломнай работы) вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі на аснове дадзенага адукацыйнага стандарту і Правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

Тэматыка дыпломных праектаў (дыпломных работ) павінна вызначацца актуальнасцю і практычнай значнасцю.

**Кіраўнікі распрацоўкі адукацыйнага стандарту**

Кіраўнік калектыву
распрацоўшчыкаў Т.А.Навагродскі
_____._____.2021

Старшыня ВМА па гуманітарнай
адукацыі А.М.Здрок
_____._____.2021

Рэктар Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта А.Д.Кароль
_____._____.2021

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь

І.А.Старавойтава
_____._____.2021

УЗГОДНЕНА
Дырэктар ДНУ «Цэнтр
даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі»

А.І. Лакотка
_____._____.2021

**Эксперты:**

Дырэктар Нацыянальнага
гістарычнага музея
Рэспублікі Беларусь

А.В.Храмы
_____._____.2021

Рэктар Дзяржаўнай установы
адукацыі «Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы»

Ю.П.Бондар
_____._____.2021